# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ БІБЛЕЙСКАГА СЮЖЭТА Ў АПОКРЫФЕ КАРЭЛА ЧАПЭКА «КРЭДА ПІЛАТА»

**П. А. Давыдава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*palinadavydava@gmail.com;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Мэтай дадзенай працы з’яўляецца выяўленне спецыфікі інтэрпрэтацыі біблейскага сюжэта ў апокрыфе Карэла Чапэка «Крэда Пілата». Пераствараючы біблейскі сюжэт, аўтар змяняе вобразы герояў: Пілат і Язэп робяцца носьбітамі адметных ідэй.

***Ключавыя словы:*** апокрыф; прыпавесць; ісціна; Карэл Чапэк.

«Кніга апокрыфаў» (*Kniha apokryfů*, 1945) Карэла Чапэка выйшла асобным выданнем у 1945 годзе, праз сем год пасля смерці аўтара. Апокрыфы ствараліся пісьменнікам з 1920-га па 1938-ы гг., большую частку творчага жыцця. Творы «Кнігі апокрыфаў» можна падзяліць на тры групы паводле тэматыкі: міфалагічныя, біблейскія, літаратурныя.

Апокрыф – твор, які развівае тэмы, ідэі і сюжэты Старога і Новага Запаветаў, які арыентуецца на кананічныя формы, але па якіх-небудзь прычынах не ўваходзіць у канон. Для апокрыфаў характэрны пэўныя рысы, якія абумоўліваюць іх неўваходжанне ў шэраг кананічных тэкстаў:

1) апокрыфы ствараліся дзеля таго, каб дапоўніць біблейскія творы, раскрыць незакранутыя тэмы і сюжэты;

2) у апокрыфах выказваліся погляды, супрацьлеглыя кананічным тэкстам;

3) апокрыфы мелі мноства выдумкі, па гэтай прычыне яны пашыраліся ў асяроддзі людзей;

4) у апокрыфах выкарыстоўваліся рэлігійна-паэтычныя вобразы, якія былі больш набліжаныя да людзей, чымся дагматычныя палажэнні [1, с. 44].

Папярэдне пералічаныя пункты характарызуюць апокрыф Карэла Чапэка «Крэда Пілата» (*Pilátovo krédo,* 1920) у рэчышчы рэлігійна-кананічных тэкстаў. Жанр апокрыфа не абмяжоўваецца толькі рэлігійным разуменнем. Літаратуразнаўца Л. У. Серабракова выдзяляе жанр рамана-апокрыфа [3]. Раман-апокрыф складаецца з евангелічнай фабулы і раманнага сюжэта. Апокрыф Карэла Чапэка «Крэда Пілата» можна ахарактарызаваць як прыпавесць-апокрыф.

У прыпавесці-апокрыфе евангелле з’яўляецца фабульным складнікам, а прыпавесць – сюжэтным. Прыпавесць – эпічны жанр, які ўяўляе сабой кароткі павучальны аповед у алегарычнай, іншасказальнай форме [2, с. 808]. Можна выдзеліць рысы прыпавесці, характэрныя для твора «Крэда Пілата»:

1) кампазіцыя твора Карэла Чапэка адпавядае прыпавесцевай кампазіцыі;

2) вобразы герояў твора з’яўляюцца парабалічнымі, бо маюць сваю ідэю, якая можа ўніверсалізавацца;

3) у творы прысутнічае мараль (сцверджанне Пілата пра магчымасць існавання «многіх ісцін»).

Дзеянні ў прыпавесці-апокрыфе будуюцца на аснове адзінай фабулы, але прадугледжваюць разнастайныя інтэрпрэтацыі сюжэта. Захоўваючы евангелічную фабулу, прыпавесць-апокрыф пераасэнсоўвае ідэйны змест біблейскага тэксту. Гэта праяўляецца ў адмаўленні ад рэлігійнага разумення праблемы твора і ў змяненні (дапаўненні) праблематыкі твора ў цэлым.

Твор Карэла Чапэка «Крэда Пілата» – апокрыф біблейскай тэматыкі, на што ўказвае яго назва. У апокрыфе «Крэда Пілата» Карэл Чапэк дапаўняе біблейскую гісторыю, звязаную з падзеямі пасля ўкрыжавання Хрыста. Апокрыфы Карэла Чапэка на біблейскую тэматыку («Святая ноч» (*Svatá noc*, 1930), «Марфа і Марыя» (*Marta a Maria*, 1932), «Лазар» (*Lazar*, 1932), «Пра пяць хлябоў» (*O pěti chlebích*, 1937), «Укрыжаванне» (*Ukřižování*, 1927), «Вечар Пілата» (*Pilátův večer*, 1934) найбольш набліжаныя да класічнага жанру апокрыфа, бо ў іх адбываецца непасрэдная інтэрпрэтацыя біблейскіх сюжэтаў.

Да апокрыфа «Крэда Пілата» Карэл Чапэк дадае эпіграф, Евангелле ад Яна, 18, 37–38, тым самым падае першапачатковую крыніцу біблейскага сюжэта. Калі разглядаць твор Карэла Чапэка «Крэда Пілата» як прыпавесць-апокрыф, то можна сцвярджаць, што ў эпіграфе заключана фабула твора. Урывак з Евангелля з'яўляецца асновай для стварэння твора Карэла Чапэка.

Апокрыф «Крэда Пілата» па форме з'яўляецца дыялогам паміж двума героямі: Пілатам і Язэпам Арыматэйскім. У біблейскім тэксце таксама адбываецца размова Пілата з Язэпам: «Пасьля гэтага Язэп з Арыматэі, вучань Ісуса, але тайны – ад страху перад Юдэямі, прасіў у Пілата, каб зьняць Цела Ісусава; і Пілат дазволіў. Той пайшоў і зьняў Цела Ісусава» (Евангелле ад Яна, 18:38). У апокрыфе Карэл Чапэк дапаўняе і словы Пілата, і Язэпа. Аўтар уводзіць у твор біблейскіх герояў, якія ў Евангеллі ад Яна не маюць канкрэтнай ідэі, але ў апокрыфе «Крэда Пілата» робяцца носьбітамі ўласнай ідэі.

Найбольш поўна ў апокрыфе прадстаўлены вобраз Пілата, яго словы займаюць большую частку твора. Карэл Чапэк не робіць Пілата негатыўным вобразам: ён апраўдвае яго дзеянні, датычныя да пакарання Ісуса. Самаапраўданне Пілата зыходзіць з супрацьпастаўлення «адной ісціны» і «многіх ісцін»: Хрыстос нясе «адну ісціну», прыхільнікі якой пачнуць забіваць усіх, хто яе не падтрымлівае. Згодна з Пілатам, прысуд Хрысту быў неабходны, каб пазбегнуць існавання «адной ісціны»: «…праз нейкі час яго вучні будуць укрыжоўваць іншых; у імя яго, у імя яго ісціны будуць укрыжоўваць і катаваць усіх іншых, забіваць іншую ісціну і ўзнімаць на плечы іншых Варав. Той чалавек казаў пра ісціну. Што ёсць ісціна?» (*Пераклад з чэшскай тут і далей мой. – П. Д.*), («…za nějaký čásek budou jeho žáci křižovat jiné; ve jménu jeho jména, ve jménu jeho pravdy budou křižovat a mučit všechny jiné, zabíjet jiné pravdy a zvedat na ramena jiné Barabáše. Ten člověk mluvil o pravdě. Co jest pravda?») [4, s.57]. Паколькі Карэл Чапэк апраўдвае Пілата, то словы «…я ніякай віны не знаходжу ў Ім» («…Já žádné viny na něm nenalézám») [4, s. 57] можна суаднесці не толькі з Ісусам (прамаўляе Пілат), але і з самім Пілатам (прамаўляе Чапэк).

У апокрыфе «Крэда Пілата» ідэя Пілата наконт ісціны супрацьпастаўляецца ідэі Язэпа Арыматэйскага. Язэп Арыматэйскі сцвярджае, што ісціна – гэта загад, яна адзіная для ўсіх: «Ісціна – гэта не загад камандзіра, … а загад розуму» («Pravda není rozkaz velitele, …ale rozkaz rozumu») [4, s. 58]; «Няма маёй ісціны … Ёсць толькі адзіная ісціна для ўсіх» («Není mé pravdy … Je jen jedna jediná pravda pro všechny») [4, s. 58]. Пры гэтым для тлумачэння значэння «адзіная» Язэп удакладняе, што гэта «Тая, у якую я веру» («Ta, ve kterou věřím») [4, s. 58].

Праз вобраз Пілата Карэл Чапэк выказвае сваё стаўленне да ісціны. Пілат сцвярджае, што ў свеце існуе шмат ісцін: «Думаю, што нават у рэчаіснасці ёсць месца для многіх ісцін» («Myslím si, že i v realitě je místo pro mnoho pravd») [4, s. 58]. У творы з ісцінамі параўноўваюцца крэсла, лаўка, свет з вышыні гор, краіны дзеля таго, каб падкрэсліць існаванне розных пунктаў гледжання на пэўныя прадметы. Душа чалавека жыве не толькі ў ісціне, але і ў яго памылках, адпаведна, існаванне ісціны без памылак немагчымае: «…у тваёй памылцы гэтак жа шмат тваёй душы, як у тваёй ісціне» («…v tvém omylu je stejně mnoho tvé duše jako v tvé pravdě») [4, s. 58]. Пілат выказвае сваю канцэпцыю жыцця ў гармоніі з наваколлем: калі нельга аб’яднаць супрацьлеглыя ісціны, то могуць аб’яднацца людзі: «Наблізіцца да гэтага шырокага вобраза і разам з тым апрацоўваць сваё маленькае поле» («Přilnout k této široké podívané a přitom pěstovat své malé pole») [4, s. 59].

Пытанне «Што ёсць ісціна?» паўтараецца ў апокрыфе некалькі разоў, менавіта гэтай фразай Карэл Чапэк і завяршае твор. Пытанне застаецца адкрытым, бо Пілат згодна са сваёй ідэяй «многіх ісцін» не можа даць на яго адказ: «Свет мусіць быць неабсяжна вялікім, бязмежным і вольным, каб у ім змясціліся ўсе магчымыя ісціны» («Musil by se udělat svět nesmírně veliký, rozložitý a volný, aby se do něho vešly všechny různé pravdy») [4, s. 59].

Такім чынам, у апокрыфе «Крэда Пілата» Карэл Чапэк захоўвае біблейскіх герояў (Пілат, Язэп Арыматэйскі), пры гэтым іх вобразы дапоўненыя аўтарскай інтэрпрэтацыяй: Пілат апраўданы за вынесены прысуд, кожны з герояў мае сваю ідэю. Пілатава ідэя «многіх ісцін» супрацьпастаўляецца Язэпавай ідэі «адной ісціны». Карэл Чапэк паўтарае ў канцы твора пытанне «Што ёсць ісціна?», якое сцвярджае магчымасць суіснавання ідэй абодвух герояў. Пытанне з’яўляецца рытарычным, бо згодна з ідэяй «многіх ісцін» на яго не існуе адзінага адказу. Гэтым фіналам аўтар запрашае чытача да разважанняў над праблемай твора.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Гладкова, О. В.* Апокриф / О. В. Гладкова // Литературная энциклопедия терминов и понятий /А. Н. Николюкин [и др.]; под ред. А. Н. Николюкина. – Институт научн. информации по общественным наукам РАН. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – С. 44–46.
2. *Гладкова, О. В.* Притча / О. В. Гладкова // Литературная энциклопедия терминов и понятий /А. Н. Николюкин [и др.]; под ред. А. Н. Николюкина. – Институт научн. информации по общественным наукам РАН. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – С. 808–809.

3. *Серебрякова, Л. В.* Роман-апокриф как литературный феномен : автореф. дис. канд. фил. наук : 10.01.08. ; 03.11.12 / Л. В. Серебрякова ; ФГБОУ ВПО «Пермский государственный гуманитарно-педагогический университет». – Екатеринбург, 2012. – 24 с.
4. *Čapek, K.* Kniha apokryfů [Eletronický zdroj] / K. Čapek. – Přístupový režim : http://web2.mlp.cz/koweb/00/03/34/76/35/kniha_apokryfu.pdf. – Datum přístupu : 26.04.2021. – 112 s.